www.xtrapapers.com

M12/1/A1BEL/SP1/BEL/TZ0/XX

22120027

International Baccalaureate®
Baccalauréat International
Bachillerato Internacional

**BELARUSIAN A1 – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A1 – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A1 – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Thursday 10 May 2012 (morning)
Jeudi 10 mai 2012 (matin)
Jueves 10 de mayo de 2012 (mañana)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a commentary on one passage only. It is not compulsory for you to respond directly to the guiding questions provided. However, you may use them if you wish.
- The maximum mark for this examination paper is *[25 marks]*.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Rédigez un commentaire sur un seul des passages. Le commentaire ne doit pas nécessairement répondre aux questions d'orientation fournies. Vous pouvez toutefois les utiliser si vous le désirez.
- Le nombre maximum de points pour cette épreuve d'examen est *[25 points]*.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un comentario sobre un solo fragmento. No es obligatorio responder directamente a las preguntas que se ofrecen a modo de guía. Sin embargo, puede usarlas si lo desea.
- La puntuación máxima para esta prueba de examen es *[25 puntos]*.


© International Baccalaureate Organization 2012

www.xtrapapers.com



*Напішыце каментарый да* ***аднаго*** *з наступных тэкстаў:*

**1.**

**Біточкі па-беларуску**

Едучы нядаўна з адным шанаваным мною пісьменьнікам, чые творы ўжо колькі гадоў уключаныя ў школьныя праграмы, у правінцыйны заходнебеларускі горад, куды нас запрасіла на творчыя сустрэчы мясцовае Таварыства Беларускай Мовы (ТБМ), я ўсю дарогу адчуваў нейкую невытлумачальную тугу. Хутчэй за ўсё, гэта туга ад перадвызначанасьці падарожжа. Ці ад таго, якім я яго сам сабе намаляваў. Сумны бетонны краявід за брудным вакном раённага гатэлю, крыху бажавольныя актывісты ТБМ, тоўстыя, залатазубыя настаўніцы роднай мовы ды іхныя прыдуркаватыя выхавальнікі. Клясічнае беларускае надвор’е з дажджом па-над раскіслымі разорамі толькі спрыяла маім жыцьцянярадасным фантазіям.

Аўтастанцыя выглядала такой самай, якой я яе й уяўляў. З засьмечаным пэронам, зь некалькімі іржавымі камэрцыйнымі шапікамі ды дрэнным рэпрадуктарам, які пісклівым галаском аб’явіў наш прыезд. «Як тут можна жыць?» — запытаўся я ў пісьменьніка. «Мяне больш цікавіць, чаму нас не сустрэлі», - адказаў ён.

Раптам на пляцоўку выплыла чырвоная й бліскучая, нібы толькі з канвэеру, AUDI-цыгара, з адчыненага вакна якой на ўсю ваколіцу неслася «вітам, панове, я Казік Пясэцкі*». Затым з аўтамабіля паказаўся й сам герой песьні. Высачэзны бляндын у піжонскім скураным паліто. З-пад неверагоднай велічыні капелюша віжавалі шэрыя, прыгожыя вочы. Раптам незнаёмец накіраваўся да нас. «Я Казімір, бухгальтар раённага ТБМ. Ну як там у Менску?» — працягваючы татуіраваную руку, ды выпускаючы струмень дарагога тытунёвага дыму, запытаўся ён, міжвольна гледзячы на нас зьверху ўніз.

У аўто сядзеў яшчэ адзін чалавек. Саракагадовы пан з акуратна зачасанымі чорнымі валасамі. Пах моцнай парфумы надзвычай пасаваў ягонаму дыхтоўнаму гарнітуру з круглым значком ТБМ на штрыфэлі. «Знаёмцеся, гэта наш бос. Старшыня раённай рады», — прадставіў нам свайго калегу бляндын, калі мы патанулі ва ўтульнасьці нямецкага салёну. «Спачатку едзем у гатэль. Затым сустрэча з актывам, а заўтра праедземся па школках», — паінфармаваў бос. «І Захад нам дапаможа», — чамусьці згадалася мне.

Бухгальтар раённага ТБМ узмацніў гук і рвануў машыну зь месца. Далей я толькі пасьпяваў схопліваць карцінкі раённага жыцьця: сьвежапафарбаваны баракальны касьцёл; бронзавы першадрукар, падобны да крыжаноснага рыцара, які замест мяча абапёрся на фаліянт з мудрым надпісам «Бярыце і чытайце»; забітая выключна маладой публікай заля бібліятэкі; і яшчэ вельмі разумныя вочы дзяцей у вясковай школе.

Трохі аддыхаўшыся ў гатэлі, я нарэшце заўважыў, што вокны нумару выходзілі на сярэднявечны замак часоў Вялікай Літвы. Маленькія хаткі тутэйшых жыхароў нахабна падступаліся да самых сьценаў помніка даўніны. Тым самым надаючы замку выгляд вельмі вялікага, пакінутага дому. Гаспадары якога абавязкова вернуцца.

www.xtrapapers.com



Даўно заўважыў — людзі, для якіх беларуская мова ёсьць толькі прафэсійным абавязкам ці гістарычным помнікам, нехаця пачынаюць гаварыць штампамі кепскіх гістарычных п’есаў. «Да нас прыехаў наш цудоўны пісьменьнік, чые творы назаўжды ўваходзяць у скарбоньку духоўнай культуры нашай зямелькі. Павітаем, дзеці, жывога клясіка.» Колькі разоў я гэта чуў, столькі ж і не шкадаваў пра скарачэньне беларускамоўнага навучаньня. Але ні у кога гэтая мова не гучыць больш пераканаўча й жыва, чым у дзяцей. ТБМаўскі бос, а па-сумяшчальніцтву яшчэ й завадзкі сьлесар, павёў нас да сябе ў інтэрнат у госьці. У адным з пакояў гуляліся інтэрнатаўскія дзеці. Пакой зьвінеў, рагатаў і енчыў нашаю моваю. «Ды так, зарганізаваў нешта накшталт дзіцячага клюбу. Бацькі ж ня супраць», — патлумачыў карціну бос.

Седзячы перад ад’ездам у няўтульным савецкім рэстаране, уся выгода якога заключалася ў замкавай вежы ў вакне, я ці не ўпершыню за мінулыя суткі ўлавіў чужую гаворку. Цераз столік ад нас размаўлялі паміж сабой сівы сьвецкі леў з кілішкам каньяку ў руцэ й трыццацігадовы маладзён, падобны да зоркі апэрэты. Размаўлялі па-француску. Бухгалтар ТБМ патлумачыў: «Гэты стары – сапраўдны француз. Ды яшчэ й марксіст у дадатак. Зьбег аднекуль з Бретоні ў 60-х, каб самому будаваць камунізм. Да гэтай пары ўсё будуе». «Ты лепш ў яго запытайся, як тут можна жыць», — параіў мне пісьменьнік. Але седзячы ў захалусным рэстаране ды жуючы біточкі па-беларуску пад шансонны дыялёг, мне, можа, упершыню не захацелася ў Парыж.

Зьміцер Бартосік, *Чорны пісталет*, Наша Ніва: Вільня-Менск (2002)

---

* «вітам, панове, я Казік Пясэцкі»: гэта першыя два радкі песні з калекцыі «Народны Альбом». Вось наступныя радкі: «Я рэакцыйны/ Я антысавецкі».

– Якім чынам аўтар карыстаецца кантрастамі ў гэтым тэксце?

– З якой мэтай і як аўтар апісвае людзей і мясьціны?

– Якім чынам аўтар ужывае сродкі мовы ў гэтым тэксце?

www.xtrapapers.com



**2.**

Аб дзьверы яе хлапцы разьбівалі лбы,
пасьля залізвалі раны з рыльца за ровам.
А сонца хавалася ў шатах яе вярбы,
а вецер ганяўся па лузе за ейным роварам.

Цёткі казалі: “Надта ж любіць сябе”.
Дзеўкі казалі: “Хопіць фарсіць, карова!”
Хлапцы маўчалі. Адзін выразаў імя на вярбе,
іншы лісты пакідаў на багажніку ровара.

Дні цяклі, як заўжды: касьба, малацьба,
рыбнагляд, браканьерства, схаваны бровар.
А малец пісаў у рыфму: “Вярба – судзьба”,
а іншы таксама ў рыфму: “Ровар – гейм овэр”.

Дзяўчыну зьвязуць у горад – і ўсё, труба!
Мужык яе, кухар (па-гарадскому “шэф-повар”),
нядаўна купіў круты рэстаран “Вярба”
і мае крутую тачку маркі *Land Rover*.

Палова вёскі нап’ецца – у знак журбы,
другая ўжо будзе пад мухай, а мух тут прорва …
А вецер пляце на прутках ейнай вярбы,
а сонца вяжа на сьпіцах ейнага ровара.

Андрэй Хадановіч, *Выхаваньне пачуцьцяў. Вершы*, Dziejaslou 40 (2009)

– Як вы ацэньваеце сэнсоўнасьць словаў “вярба” і “ровар” у вершы?

– Якую ролю адыгрываюць два апошнія радкі верша ў цэлым?

– Як паэт карыстаецца сродкамі мовы ў вершы?